*Таццяна Куратнік*

# КАЛЯНДАРНА-ПЕСЕННАЯ КУЛЬТУРА ЛІДЧЫНЫ
## (па матэрыялах фальклорнай экспедыцыі БДАМ 2016 г.)

*Да нашых дзёнфальклорная песенная традыцыя Лідчыны з'яўляецца маладаследаванай. У артыкуле аналізуецца стан сучаснай каляндарна-песеннай традыцыі гэтай часткі Панямоння. Артыкул напісаны па матэрыялах фальклорнай экспедыцыі БДАМ 2016 г.*

*To this day, the folk song tradition of Lidchinais of little explored. The article analyzes the state of the modern calendar-song tradition of this part of Ponemonia. The article is written on the materials of the folk expedition BGAM 2016.*

Да апошняга часу фальклорная музычная спадчына Лідскага раёна не была дасканальна апісана і даследавана ні ў агульным плане, ні ў асобных частках. У навуковых працах сустракаюцца адзінкавыя спасылкі на яе матэрыялы, або і яны адсутнічаюць. Напрыклад, Р. Р. Шырма, які ў сваім фундаментальным выданні «Беларускія народныя песні» шырока прадставіў песні розных жанраў, узораў каляндарна-песеннай традыцыі Лідчыны не падаў [5]. Т. Б. Варфаламеева у працы «Песні Беларускага

Панямоння» аналізуе музычна-стылявыя асаблівасці песень і напеваў, сабраных больш чым у 60 населеных пунктах Гродзеншчыны, што дае дастаткова поўную карціну музычнай традыцыі Панямоння [*1], Лідскі раён тым не менш застаецца па-за межамі яе даследавання [1]. Да 2016 г. у фондах кабінета традыцыйных музычных культур Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі захоўваліся толькі кропкавыя фіксацыі з гэтага раёна. Такім чынам, з пункту гледжання задач комплекснага вывучэння, яго песенная традыцыя заставалася па-за ўвагай збіральнікаў і даследчыкаў. З гэтай прычыны ў 2016 годзе, у перыяд з 28 чэрвеня па 24 ліпеня, пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры беларускай музыкі Л. Ф. Баранкевіч і педагога кафедры А. А. Паласмак была накіравана спецыяльная фальклорная экспедыцыя на Лідчыну. Запісвалі творы студэнты кафедраў музыказнаўства і кампазіцыі БДАМ. Падчас экспедыцыі было абследавана 26 вёсак (Парачаны, Феліксава, Дзмітраўцы, Макары, Папераўцы, Гарні, Верх-Ліда, Беліца, Панямонцы, Масевічы, Жучкі, Ганчары, Калесішча, Крупава, Ваверка, Дылева, Мэйры, Малыя Канюшаны, Сялец, Дзітва, Мохавічы, Бялевічы, Няцечы, Дакудава, Ёдкі і хутар Збляны) і запісана звыш 640 узораў народна-песеннай культуры.

Рэгіянальная спецыфіка каляндарна-абрадавых традыцый Панямоння, асобную частку якога займае Лідскі раён, абумоўлена сукупнасцю такіх яе складнікаў, як: узаемадзеянне мясцовых і культурных плыняў, якія ідуць з Паазер'я, Брэсцкага Палесся, Польскага Падляшша, Літоўскай Дзукіі, а таксама поліканфесіянальнасць насельніцтва, дзе суіснуюць дзве галіны хрысціянства – праваслаўе (60% жыхароў) і каталіцызм (25%). Адсюль большая, чым у іншых (асабліва ўсходніх) рэгіёнах Беларусі, ступень рэлігійнасці жыхароў,

своеасаблівасць рытуальна-абрадавых практык і шляхоў іх ажыццяўлення. Акрамя таго, у выніку складанага спалучэння, узаемадзеяння, узаемапранікнення дахрысціянскай і хрысціянскай традыцыі у сучасны перыяд на Панямонні, як і ў іншых раёнах Беларусі, функцыянуе свой каляндар свят і абрадаў, часавая прымеркаванасць якіх вызначаецца арыентацыяй на царкоўны. Тадыцыйныя абрадавыя песні Лідчыны, у залежнасці ад прызначэння, складаюцца з трох цыклаў: каляндарна-абрадавага, сямейна-абрадавага і цыкла ўмоўна прымеркаваных.

У каляндарным цыкле Лідскага раёна найбольшай разгорнутасцю і развітасцю вызначаюцца вясенне-летнія песні. Выразна адчуваецца стылявы ўплыў на іх песень познетрадыцыйнай творчасці. Асабліва гэта заўважаецца ў цыкле мясцовых юраўскіх з іх шырокай распеўнасцю і вольным дыханнем.

Нягледзячы на тое, што большая частка запісаў – беларускія песні розных жанраў, вялікі пласт складаюць польскія ўзоры. Гэта *коленды, кантычкі і пастаралкі, «васольныя» («вельканоцныя»),* у тым ліку *«маёвыя» і «велькапосныя», «васэльныя« (вясельныя) песні,* сярод якіх – *«васэльныя сірочыя»*, а таксама балады, любоўныя, «*жолнерскія»* (салдацкія), *уланскія,* сямейна-бытавыя, жартоўныя, *«мнагалецце»* і інш.

У каляндарна-абрадавай творчасці на Лідчыне аснову складаюць дзве абраднасці – калядная і валачобная. Летні і асенні перыяд аб’яднаны тэмай жніва. У асобных вёсках жыхары памятаюць батлейку, а таксама святкуюць Юр’я (хутар Збляны, в. Панямонцы). Аднак у цяперашні час святы Юр’я, Сёмуха (Троіца), Ян (Купалле) праходзяць без выканання абрадавых песень. Па сведчанні інфармантаў, у гэтыя дні спяваюць «абы якія» песні, па большай частцы лірычныя любоўныя,  сямейна-бытавыя,

жартоўныя. Купалле («Ян») для дадзенай тэрыторыі не характэрна. У нашыя дні Ян святкуецца ў многім дзякуючы раённаму аддзелу культуры і мясцовым клубам, якія, на жаль, бывае, займаюцца «адраджэннем» зусім не тыповых для канкрэтнага рэгіёна абрадаў, забываючыся пра сваё адметнае.

Аснову абрадавага календара на Лідчыне складаюць калядныя песні. На Каляды каталікі спявалі польскія календы («A wczora z wieczora», «Lulaj że, Jezuniu», «Bóg się rodzi», «Dźisiaj w Betleem», «Wesoła nowina», «Wśród nocnej ciszy»), а праваслаўныя – псальмы-калядкі, якія выконваліся і цяпер выконваюцца, але ў меншай ступені, у час хаджэння па вёсцы «са звяздой». На жаль, дахрысціянскіх калядных ужо не спяваюць, відаць, яны выйшлі з ужытку; аднак некаторыя жыхары Лідчыны сведчаць, што раней спявалі калядныя песні і хадзілі з «казой»: «*Прыбяруцца казою, усе прыбяром… Але ў нас ужо яксці такога не было*» [*1]. У асобных вёсках абрад ваджэння «казы» праводзіўся не дарослымі, а пераапранутымі ў «казу» хадзілі толькі дзеці. Часам ужываліся маскі іншых жывёл.

Найбольш поўна ў этнаграфічным плане быў зафіксаваны калядны абрад, а таксама сведчанні пра куццю. На Лідчыне ў якасці куцці магла быць пярловая ці рысавая каша. Так, у вёсцы Жучкі нам расказалі пра тры традыцыйныя куццці: 1. «Куцця»; 2. «Шчэдра багатая» (мяса, бліны, калбасы, верашчака); 3. «Куцця посная». Менавіта ў Жучках куцця – гэта пярлоўка з ягадамі і мёдам. Тут куццю варылі з пярлоўкі, у якую дабаўлялі ягады і мёд. Спявачка з в. Дзмітраўцы Лідзія Аляксандраўна Манікала (1941 г. н.) расказала пра тое, як святкавалі Каляды, якую ежу елі:

*«На Коляды пяклі галушкі ў печы, варылі кісель, рабілі сялёдку або кепса. Маці квасіла буракі, капусту і грыбы, таму як прымушвалі пасціцца. Сеялі свой авёс, таўклі ў ступе і варылі кісель. На стол слалі белы абрус, пад ім ляжала сена. На стале павінна было быць 12 страў. Тата ўстае, ўсе крэсцяцца, пробуюць куццю, кожны сваёй ложкай. Куццю варылі з пацаку, называлася яна "каша", а ў Шчучыне – "куцця"; ставілася куцця ў цэнтры стала. Начыналі адразу есці сялёдку, грыбы, апошняе – галушкі. Галушкі выпякаліся ў печы з сваёй пшанічнай мукі. Пшаніцу вальцавалі ў жарнах, абпрацоўвалі веялкай – мелкія адлятали, а крупнейшыя шлі на галушкі ці на піраг. На Коляды мама пякла мала пірагоў, больш пякла на Вялікдзень або на Тройцу. Калі ўсе паелі, маці збірала ложкі, складвала да гары каля міскі – для пакойнікаў астаўлялі на нач.*

*Назаўтра мама варыла "верашчаку" ў сагане ў печы. Яшчэ варыла на Коледы і пакідалася свіная галава – з яе варыла верашчаку. З вадой, цыбуляй, прыправамі варыла ў сагане, а потым нарызала кубікамі. На стале стаяў не цэлы саганчык, а "чэрап". Кожнаму хацелася злавіць скварачку».*

У Лідскім раёне на Коляды хадзілі са «звяздой», але спявалі ў гэты час не пад вокнамі, а часцей за ўсё ў хатах. Таксама гулялі ў розныя гульні, варажылі. Дарослыя і дзеці збіраліся на вячоркі і танцавалі. Сярод музычных інструментаў найбольшае распаўсюджанне атрымалі гармонік і барабан, у некаторых вёсках раней сустракаліся скрыпкі і цымбалы.

Вясну ў большасці вёсак не гукалі, аднак чакалі, «каб снег зышоў», каб кветачку «ўвідзець», «чакалі ручайкоў». Масленічныя абрады і звычаі на Лідчыне прадстаўлены слаба. Некаторыя жыхары казалі: «*У нас такого не было*». У асобных вёсках жыхары на Масленіцу «наймалі»

хату – «*у мацінай хаце гуляюць адны, а падросткі ўжо ў другой. Потым па вочарадзі мылі пол. Гэта быў час пасту”* [*2]. Потым пачынаюцца «запускі» (тут у значэнні «Пост») на шэсць тыдняў.

Асновай веснавога цыкла Лідскага раёна з’яўляюцца валачобныя песні. «*Мужчыны зваліся «валачобнікі»* [*2], *яны абыходзілі кожную хату, спявалі пад вокнамі, «Хрыстос Васкрэс» у хату ніхто не спяваў. Праз вакно жадалі (старэйшы мужчына, у якога быў кошык). У кошык валачобнікам давалі яйкі, кілбас, пірог, аднак мужчыны галоўнае бралі только яйкі. У кожнай вёсцы былі свае спевакі. Спявалі валачобнікі «Панянэчку» і «Вялік святы».* [*3]. Сярод нашых запісаў адзначым валачобныя песні, прысвечаныя гаспадарам і дзяўчыне («панянэчка»), жартоўную валачобную, «васольную» псальму.

Падчас фальклорнай экспедыцыі 2016 года былі таксама зафіксаваны адзінкавыя прыклады «дажыначных» і «зажыначных» песень, познія жніўныя, «як капалі бульбу». Цікавым фактам стала мясцовая назва валачобнікаў – «глыкальнікі», «глыкаўнікі», «алыкальнікі», «ваў(л)каўнікі». Як тут не ўспомніць назву «валкалак», што адсылае да старадаўні поглядаў беларусаў на валачобнікаў як на чараўнікоў! Як нам падаецца, валачобны абрад – сапраўдная дамінанта гадавога каляндарнага цыкла Лідчыны.

Абрад Юр’я на Лідчыне памятаюць і сведчаць, як ён раней праводзіўся. Вербачкай білі скацінку, закопвалі яйка, абліваліся вадой, а ў некаторых вёсках рабілі абыходы палеткаў. Тут трэба адзначыць відавочную паралель з польскім абрадам *дынгус (ці смігус)*, калі маладыя дзяўчаты і хлопцы «ходили в сопровождении музыкантов с гармонями «posmigusi», во время танцев и пения пытались облить хозяев водой…».

Аднак некаторыя інфарманты гаварылі, што раней спявалі юраўскія песні, а вось на Сёмуху (Троіцу) спявалі «абы-якія», «усялікія» песні.

У Лідскім раёне веснавыя карагоды зафіксаваны намі толькі адзінкава. Напрыклад, у вёсцы Малыя Канюшаны Ніна Серафімаўна Рыхліцкая (1942 г. н.) і Ніна Іванаўна Хромін (1943 г. н.) паказалі, як раней вадзілі карагод «Па беражку».

Нягледзячы на тое, што прыкладаў менавіта каляндарна-песеннай культуры на Лідчыне падчас фальклорнай экспедыцыі БДАМ было запісана няшмат, усё роўна можна вылучыць іх некаторыя асаблівасці, характэрныя менавіта для дадзенага раёна Панямоння.

У сваёй манаграфіі «Песні Беларускага Панямоння» Т. Б. Варфаламеева вылучае два тыпавыя валачобныя напевы [17], а музыказнаўца С. Мыцько пры даследаванні валачобных песень падраздзяляе іх на пяць тыпаў [3, *102*; 4, *40–75*]. Згодна з класіфікацыяй абодвух даследчыкаў, на Лідчыне прадстаўлены валачобныя напевы першага тыпу. Для ўсіх прыкладаў характэрна рухальная дынаміка, рытм шэсця, у большай або меншай ступені рыфмаванасць верша, варыянтнасць рытмічнага малюнку ў выніку спецыфікі вымаўлення.

Летні песенны цыкл на Лідчыне, як ужо адзначалася, аб’ядноўваецца тэмай жніва. Тут, як і паўсюдна, праводзіліся спецыяльныя абрады, спяваліся жніўныя песні. Увогуле жніво было адным з важнейшых перыядаў каляндарна-земляробчага кола, што знайшло адлюстраванне ў трохэтапнай паслядоўнасці выканання песень, пачынаючы ад зажынкавых да дажынкавых. Песні ўласна жніва захавалі ў сабе архаічныя стылявыя рысы, аднак у той жа час у іх назіраюцца пэўныя эвалюцыйныя зрухі.

На думку вядомага беларускага этнамузыколага З. Я. Мажэйкі, у жніўных напевах структурны бок (паэтычная страфа, структура верша) лакальна менш акрэслены, а спецыфічныя песенна-рытмічныя формулы пры імправізацыйнасці рытма ўвогуле не могуць быць мадэліраваны без парушэння мелодыкі [2, *245*]. Ладавая аснова жніўных песень, у тым ліку з Лідчыны, аднатыпная для ўсіх рэгіёнаў – тэрцавы лад з субквартай.

Восеньскі песенны цыкл каляндарнай абраднасці звычайна аб'ядноўваюць з летнім, разглядаючы яго як працяг апошняга. Падобна летнім жніўным, некаторыя песні восені прызначаны для выказвання на полі, але лірычны пачатак яны развіваюць больш свабодна. Восеньскі цыкл з'яўляецца набыткам выключна беларускай песеннай творчасці і самым «лірычным» сярод усіх каляндарных.

Падсумоўваючы нашы назіранні, трэба адзначыць, што так або інакш амаль усе каляндарныя абрады эвалюцыяніравалі. Паказальна, што нават у гэтых умовах у некаторых песенных прыкладах захоўваюцца архаічныя асаблівасці выканання. У якасці пацвярджэння прывядзем дажынкавую песню, запісаную ў вёсцы Феліксава ад Аліны Уладзіміраўны Грынкевіч. Гэтая спявачка ў сваім выкананні твора прадэманстравала архаічную манеру спеву. Песня вылучаецца вузкааб'ёмнай мелодыкай і ладавай арганізацыяй (лад – тэрцыя з субквартай), у якой «мігатлівая» тэрцыя чаргуецца з нейтральнай:



Асноўная частка песень, зафіксаваных падчас фальклорнай экспедыцыі БДАМ, па сваіх стылявых рысах адносіцца да больш позняга перыяду: пасля XV – XVII стст. [*3]. Вялікая колькасць узораў належыць да новай, гамафонна-гарманічнай эпохі, абапіраецца на прынцыпы мажора-мінору. У некаторых прыкладах фактура выканання шматгалосых варыянтаў кантавая. Сустракаецца таксама развітая гетэрафонія падгалосачнага тыпу.

Як нам бачыцца, фальклорная экспедыцыя 2016 года з’яўляецца толькі пачаткам даследавання каляндарна-абрадавай песеннай культуры Лідскага раёна, таму што шмат вёсак не давялося наведаць. На жаль, пераважная большасць жыхароў ужо сышла… Але тое, што яшчэ могуць паведаміць інфарманты, уяўляе вялікую каштоўнасць як рэшткі старадаўняй традыцыі і з’яўляецца істотным матэрыялам для даследавання гісторыі каляндарна-абрадавай традыцыі як дадзенага раёна, так і Панямоння.

**ЗАЎВАГІ**

*1. Панямонне – гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі, які ахоплівае тэрыторыю Гродзенскай і сумежных частак Брэсцкай і Мінскай абласцей. Песенная традыцыя Беларускага Панямоння ў асноўным ахоплівае тэрыторыі сучаснай Гродзенскай вобласці, аднак яе арэал больш шырокі і ахоплівае заходнія часткі

Цэнтральнай Беларусі і Брэсцкага Палесся, землі літоўскай Дзукіі і польскай Беласточчыны.

*2. «Валачобнікамі, як пісаў П. Шпілеўскі, называецца вядомы клас людзей, якія ў велікодны тыдзень ходзяць па вёсках з віншаваннямі: гэта штосьці накшталт старажытных гусляроў і баянаў…»

*3. Другі стылявы гістарычны пласт, па класіфікацыі маскоўскага фальклaрыста Г. В. Рудневай, – эпоха лірыкі.

**ІНФАРМАНТЫ**

**1. Запісана ад Аліны Уладзіміраўны Грынкевіч, 1952 г. н., у вёсцы

Феліксава Лідскага раёна Гродзенскай вобласці.

∗∗2. Запісана ад Марыі Браніславаўны Арлавец, 1925 г. н., у вёсцы Парачаны Лідскага раёна Гродзенскай вобласці.

∗∗3. Запісана ад Тарэсы Канстанцінаўны Корка, 1937 г. н., у вёсцы Папераўцы Лідскага раёна Гродзенскай вобласці.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Варфаламеева, Т. Б.* Песні беларускага Панямоння / Т. Б. Варфаламеева / Нац. акад. навук Беларусі; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – С. 3 – 85.

2. *Можейко, З.* Календарно-песенная культура Белоруссии: опыт системно- типологического исследования / З. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 245 с.

3. *Мытько, С. И.* Белорусский волочебный обряд и волочебные песни / С. И. Мытько // К вопросу изучения волочебного обряда и типологии волочебных песен. – Дипломная работа. – Минск, 1986. – 102 с. – Фонд КТМК БГАМ, Д-4.

4. *Мытько, С. И.* К вопросу изучения белорусского волочебного обряда и волочебных песен / С. И. Мытько // Белорусский музыкальный фольклор в исследованиях молодых этномузыковедов: сб.ст. / Белгосконсерватория; сост. Т. С. Якименко; редкол.: Т. С. Якименко, Л. Ф. Костюковец. – Минск, 1991. – С. 40– 75.

5. *Шырма, Р.* Беларускія народныя песні: у 4 т. / Р. Шырма; рэдкал.: Н. Глебка [іінш.]. – Мінск : Дзярж. выд. БССР, 1959 – 1976.